ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 108 (1075) | НЯДЗЕЛЯ, 11-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

| | |
|---|---|
| 1 месяц | 30 кап. |
| 3 месяцы | 90 „ |
| 6 месяцаў | 1 р. 80 „ |
| 1 год | 3 р. 30 „ |

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

## Да ўдзельнікаў 5-га пленуму ЦК ЛКСМБ

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“, з мэтай абмену вопытам добрых вузораў працы ячэек комсамолу ў саўгасах і калгасах, выдае ў час працы пленуму спэцыяльную старонку „Вопыт працы ячэйкі ў колгасах“.

Таму рэдакцыя зварачваецца да ўсіх удзельнікаў пленуму ЦК ЛКСМБ прыняць практычны ўдзел у выданьні гэтай старонкі.

Рэдакцыя.

# Рэволюцыйная хваля паўстаньняў ахапіла Індыю

## Шолапур у руках паўстанцаў

### У БОЙКАХ З ПОЛІЦЫЯЙ ПАЎСТАЎШЫЯ ПРАЯВІЛІ ВЫКЛЮЧНУЮ ЖОРСТКАСЬЦЬ.—ШМАТ ПОЛІЦЭЙСКІХ ЗАБІТА І ЦЯЖКА ПАРАНЕНА.—ПАЎСТАНЦЫ СПАЛІЛІ ПОЛІЦЭЙСКІЯ ВУЧАСТКІ І ПАМЯШКАНЬНЕ СУДУ.

ЛЁНДАН, 9.—Горад Шолапур знаходзіцца ў руках паўстанцаў. Ніякіх вестак адтуль за прашоўшыя суткі не атрымана. У бойках з поліцыяй паўстаўшыя праявілі выключную жорсткасьць. Шмат поліцэйскіх забіта. Астатнія атрымалі нажавыя і агнястрэльныя раны. Поліцыі у горадзе не засталося. Эўропэйскія жанчыны і дзеці эвакуяваны. Бежанцы паведамляюць, што паўстаньнем кіруюць бастуючыя рабочыя. Горад знаходзіцца ў стане грамадзянскай вайны. Колькасьць ахвяр вялізарная. Адных толькі забітых ня менш 50. Паўстанцы спалілі паліцэйскія вучасткі, піцьцёвыя крамы і памяшканьне суда. У раёне Манавалу каля Амрытцара паўстанцы опэруюць усьцяж чыгункі, нападаюць на цягнікі, перарэзалі тэлефонныя і тэлеграфныя правады. Па ўсёй Індыі адбываюцца дэмонстрацыі. У Лягоры ўсе дэмонстранты былі адзеты ў нацыянальнае адзеньне. Эўропэйскае адзеньне паліцца на вуліцах. Арыштаваны сэкратар камітэту нацыянальнага конгрэсу. Некалькі дзеячоў конгрэсу прыгавораны да турэмнага зьняволеньня.

### „Ангельскія і індыйскія рабочыя маюць агульнага ворага“

ЛЁНДАН, 9.—Комэнтуючы перадавую органу компартыі „Дэйлі Уоркер“, якая выказваецца супроць пасылкі Ляпкашырскага палка ў Індыю, рэакцыйная „Морнінг Пост“ заяўляе, што артыкул: „зьяўляецца простым падбухторваньнем да мецяжу і пагражае дзяржаўным інтарэсам“.

Сёньня „Дэйлі-Уоркер“ зноў піша: „Мы павінны спыніць пасылку войск і амуніцыю ў Індыю і змагацца за вываз з Індыі ўзброеных сіл брытанскага імпэрыялізму. Ангельскія і індыйскія рабочыя маюць агульнага ворага“.

## Крывавая бойня ў Кітаі

### Агульнае наступленьне супроць Нанкіну пачнецца ў працягу бліжэйшага тыдню

*ПЭЙПІН, 9.—Па паведамленьню агэнцтва „Рэйтэр“ з Шанхаю, нанкінскія войскі панесьлі цяжкае паражэньне ў Хэнані, дзе яны страцілі 7 тысяч чалавек. Аднак, пэйпінскай уладзе нічога аб гэтым невядома.*

*ПЭЙПІН, 9.—Па заяўленьню мясцовай улады, агульнае наступленьне супроць Нанкіну пачнецца ў працягу бліжэйшага тыдню.*

## Бастуе каля 2000 рабочых

*ВАРШАВА, 7. З Саснаўца паведамляюць, што ў трох буйных капальнях пачаліся забастоўкі протэсту супроць новых правіл работы, уведзеных у капальнях. Бастуюць каля 2000 рабочых. У раён выкліканы моцныя атрады пешай і коннай поліцыі.*

## „Напасьці на СССР рабочая кляса не дазволіць“

### „Пролетарыят растраляе, нарэшце, усіх генэралаў, якія зараз рыхтуюць вайну супроць СССР“

РЫГА, 9-5. Па поваду інтэрв'ю генэрала Радзіньша, прэм'ер міністр Цэльміньш заявіў сойму, што генэрал Радзіньш паведаміў корэспондэнту газэты „Педэа Брыды“ ня маючыя політычнага значэньня весткі аб становішчы латвійскай арміі, а тое, што газэта сказіла сэнс слоў генэрала Радзіньша, калі той тэорытычна выказваўся аб магчымасьцях вайны супроць СССР і па позіцыі Латвіі.

На пытаньне ці солідарызуецца Урад з поглядамі выказанымі ў інтэрв'ю Цэльміньш адказаў, што гэта ня погляды латвійскага ўраду. У заключэньне Цэльміньш зазначыў, што генэрал Радзіньш даў гутарку бяз ведама начальства, за што яму абвешчана вымова.

Выступаючы ў спрэчках соцыялдэмократ Мэндэрс заявіў, што ён не сумняваецца ў сапраўднасьці ў інтэрв'ю і кваліфікуе адказ ураду няcур'ёзным і няясным. Абяцаньне Польшчы „быць на яе баку ў выпадку савецка-польскага конфлікту—заявіў Мэндэрс—азначае, што Латвія павінна зараж—ужо рыхтавацца да вайны з СССР. Мы ведаем, што Радзіньш не адзін, і што за ім стаяць вядомыя колы. Гэтыя колы ставяць Латвію на пагібельны шлях.

Лайцэнс і Яршоў, дэпутаты рабоча-сялянскай фракцыі выкрылі двурушніцтва соцыял-дэмократаў якія ўдзельнічалі ў паклёпніцкай кампаніі супроць СССР і заявілі: „Ад імя працоўных Латвіі мы заяўляем латвійскай буржуазіі, што напасьці на СССР рабочая кляса не дазволіць і што яна растраляе нарэшце ўсіх генэралаў, якія зараз рыхтуюць вайну супроць СССР.

## Выбухам забіта 50 рабочых

ЛЁНДАН, 8. У Ліверпулі на маслабойным заводзе адбыўся моцны выбух. Па першапачатковых вестках забіта і ранена звыш 50 чалавек рабочых.

## Усеагульная забастоўка ў Сэвільлі

ПАРЫЖ, 8. Па паведамленьнях агенцтва ГАВАС у Сэвільлі (Гішпанія) усеагульная забастоўка працягваецца. Бастуючыя двойчы імкнуліся наладзіць дэмонстрацыю, і кожны раз яны разганяліся поліцыяй.

## У ТУРМАХ ПАЗШ

З Колюмбіі паведамляюць, што ў катаржнай турме Штату Огайо (Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі) адбыўся пажар з вялікай колькасьцю чалавечых ахвяр. Турма гэта, як і іншыя турмы ПАЗШ, была звышперапоўнена. Так, у турме ў Колюмбіі, пабудаванай на 2.000 зьняволеных, утрымлівалася 4.950 чалавек.

У часе пажару жыўцом згарэла 319 чалавек і больш 300 чалавек атрымалі цяжкія апёкі; з іх 100 чалавек пацярпелі настолькі сур'ёзна, што становішча іх безнадзейнае. Зьняволеныя праявілі вялізарную самаадданасьць, ратуючы сваіх таварышоў. Турэмнае-ж начальства перш за ўсё клапацілася аб папярэджаньні пабегаў, а не аб ратаваньні зьняволеных. Турма была абкружана войскамі, і быў адданы загад страляць з кулямётаў па кожным паказаўшымся зьняволеным.

Абурэньне зьняволеных пасьля перажытых жахаў вылілася ў бунт, але выкліканыя адміністрацыяй на дапамогу 500 чалавек спэцыяльнай аховы ўціхамірылі іх. Праз два дні ізноў выбухнула паўстаньне.

Грамадзкая думка ПАЗШ патрабуе расьсьледваньня гэтага выпадку і высьненьня вінаваўцаў катастрофы, а таксама палепшаньня агульнага становішча ў турмах.

„Чыкаго Трыбун“ у сувязі з гэтым напамінае аб бунце ў Данэморскай турме (штат Нью-Ёрку) у ліпені мінулага году і паведамляе аб высьветленых цяпер падрабязнасьцях расправы. 225 зьняволеных былі праведзены ў ізоляваны корпус, дзе іх прывязалі да кратаў дзьвярэй і сьцёгалі пугаю да страты прытомнасьці. Шмат у каго рубцы не зажылі і дагэтуль. У аднаго зьняволенага зламана рука, у другога—выбіта вока. Адзін памёр ад пабояў. Пасьля гэтага іх зусім голымі кінулі на каменную падлогу камер і пакінулі бяз ежы, піцьця і мэдыцынскай дапамогі ў працягу 4 сутак. Калі яны крычалі ад нявыноснай болі, у камеры пушчалі газы, ад якіх яны трацілі прытомнасьць. Некаторыя зьняволеныя звар'яцелі. Турэмны корпус, дзе адбывалася расправа, празваны з таго часу „бойняй“.

Вось такі рэжым у турмах краіны хваленай „дэмократыі і свабоды“.

## Налёт поліцыі на орган компартыі „Юманітэ“

Уноч на 30 красавіка політычная поліцыя Парыжу ўтварыла налёт на цэнтральны орган компартыі Францыі „Юманітэ“.

У нумары газэты, прысьвечанай 1 мая, компартыя заклікала рабочую клясу Францыі да політычнай забастоўкі і дэмонстрацый, за што газэта падпарадкавалася конфіскацыі. Ня гледзячы на налёт поліцыі ўсе-такі ўдалося распаўсюдзіць у рабочыя кварталы 8.000 экзэмпляраў газэты.

НА ЗДЫМКУ: першая старонка конфіскаванай газэты.

## Заклік да падтрыманьня бастуючых тэкстыльшчыкаў

*БЭРЛІН, 8-5. Эўропэйскі сэкратарыят Профінтэрну апублікаваў адозву, у якой заклікае рабочых усіх краін маральна і матар'яльна падтрымаць змагаючыхся ангельскіх тэкстыльшчыкаў.*

## Арышт комдэпутата тав. Шмідта

БЭРЛІН, 8-5. У Барндэнбургэ арыштаваны комдэпутат Прускага Ландтагу тав. Шмідт. Улада матывуе гэты арышт тым, што Шмідт—1-га мая выступіў з прамоваю, якая парушае Зэверынгаўскі закон аб ахове рэспублікі.

## Новая хваля рэпрэсій на Кубе

Па вестках, атрыманых з Гаванны, на высьпе Куба у першай палове сакавіка фашысцкі ўрад выдаў распараджэньне аб зачыненьні „нацыянальнай рабочай фэдэрацыі“—адзінай рэволюцыйнай клясавай організацыі Кубы. Сваё распараджэньне ўрад матываваў пакаваньнем на тое, што „названая організацыя кіруе забастоўкамі, якія маюць сваёй мэтай шляхам націску на прадпрыемцаў дабіцца падвышэньня зарплаты“. У адказ на гэтае распараджэньне ўраду, профсаюзы, якія ўваходзяць у склад фэдэрацыі, аднагалосна рашылі абвясьціць аднадзённую забастоўку протэсту. Забастоўка была назначана на 20 сакавіка, калі ў краінах Лацінскай Амэрыкі павінен быў праводзіцца міжнародны дзень беспрацоўных. Ня гледзячы на прынятыя поліцыяй захады—(налёты на ўсе памяшканьні профсаюзаў і арышты ўсіх кіраўнікоў саюзаў), забастоўка протэсту прайшла з выключным посьпехам. Увесь рух у горадзе быў прыпынены. Усе заводы і большасьць гандлёвых памяшканьняў былі прымушаны зачыніцца. Ніводная газэта, за выключэньнем урадавага офіцыёзу „Геральдо дэ Куба“ ня вышла. Да забастоўшчыкаў прымкнулі нават вучні вышэйшых і сярэдніх школ.

Маючы на ўвазе поліцэйскі налёт, забастоўшчыкі пільна забарыкадавалі ўсе подступы да цэнтральных памяшканьняў „нацыянальнай рабочай фэдэрацыі“. Аднак, ня гледзячы на мобілізацыю агромністых поліцэйскіх і ваенных сіл, урад не рызыкнуў браць прыступам памяшканьне фэдэрацыі: надзвычайна вялікая рашучасьць да супраціўленьня адчувалася ў працоўных, што абкружалі памяшканьне фэдэрацыі.

Агулам, у забастоўцы 20 сакавіка ўдзельнічала звыш 200 тысяч рабочых. Забастоўкі і мітынгі праходзілі ня толькі ў Гаваньне, але і ў другіх гарадох Кубы. На ўсіх мітынгах былі прыняты рэзолюцыі, у якіх рабочыя патрабавалі безадкладнай адмены забароненьня „нацыянальнай рабочай фэдэрацыі“, аслабаненьня ўсіх політычна зьняволеных, у першую чаргу, затрыманых у сувязі з падрыхтоўкай забастоўкі 20 сакавіка, прызнаньня за рабочымі права ўступаць у саюзы дзеля абароны сваіх эканамічных інтарэсаў, права забастовак, безадкладнага ўдаленьня поліцыі з занятых ёю памяшканьняў фэдэрацыі.

У адказ на гэтыя патрабаваньні ўрад узмацніў рэпрэсіі супроць рабочых і аддаў распараджэньне аб безадкладным прыцягненьні да суда ўсіх арыштаваных правадыроў фэдэрацыі, рабочых і студэнтаў. У выніку—200 чалавек прыцягнуты да суда па абвінавачваньню ў прыналежнасьці да комуністычнай партыі. Некаторым з падсудных, у тым ліку правадыру кампартыі, Мартынец Вільлену, аднаму з найбольш актыўных організатараў кубанскага рабочага руху, пагражае сьмяротная кара. Побач з урадам, супроць рабочых выступаюць прадпрыемцы: на ўсіх рабочых, што ўдзельнічалі ў забастоўцы-протэсту 20 сакавіка накладзены буйныя грашовыя штрафы, а рабочыя-чужаземцы зволены.

Рабочыя, з свайго боку, рыхтуюцца да барацьбы супроць новай хвалі тэрору. Профсаюзы ўтварылі аб'яднаны камітэт барацьбы, які павінен замяніць забароненую „нацыянальную рабочую фэдэрацыю“ у справе кіраўніцтва рабочым рухам. Па ўсёй Кубе распаўсюджваюцца падпольныя лістоўкі і адозвы. Разам з тым, рабочыя Кубы заклікаюць сусьветны пролетарыят выступіць на іх абарону, організацыяй дэмонстрацыі перад пасольствам і консульствамі Кубы.

## Парадак водпуску

### Недастатковых прамтавараў насельніцтву гарадоў і рабочых пасёлкаў

МАСКВА, 9.—Саюзны Наркамгандаль зацьвердзіў парадак водпуску недастатковых прамтавараў насельніцтву гарадоў і рабочых пасёлкаў. Прамысловыя тавары цэнтралізаванага забясьпечаньня дзеляцца на 3 асноўныя групы. Да першай групы аднесены баваўняныя і ільняныя тканіны, віткі і гаспадарчае мыла. У другую групу ўваходзяць: гатовая адзежа, трыкатаж, абутак, галёшы. Усе астатнія прамтавары адносяцца да 3-й групы. Тавары першай групы выдаюцца працоўным выключна па заборных кніжках і цьвёрдых нормах.

Пры разьмеркаваньні тавараў другой групы ўнутры гарадоў у першую чаргу павінны забясьпечвацца крамная сетка, якая абслугоўвае рабочыя раёны. Тавары трэцяй групы прадаюцца ў звычайным парадку, і ўсякія абмежаваньні ў іх водпуску могуць устанаўлівацца толькі з дазволу Наркамгандлю СССР. Новы парадак водпуску недастатковых тавараў уводзіцца з 10-га мая.

# Літаратурная старонка

В АЛЕНІН

## Аннібалава прысяга

(апавяданьне)

(Працяг. Пачатак гл. у № 95 „Ч.З.“)

II

Верачка іграла Шопэна. Лірычныя гукі польскай музыкі ўспрымаліся з глыбіні. Седзячы на канапе, Пятроў сачыў, як хутка бегалі доўгія кволыя пальчыкі па белых клявішах, бачыў залаты шоўк валос Верачкі, і ў гэтую хвіліну яму здавалася, што ўвесь сьвет — адна хвалюючая сымфонія.

Трывожныя думкі былі забыты. У грудзёх разьлівалася радасная, здаровая цяплыня.

Мяккі атлас мэблі, мяккія дываны, цяплыня ў пакоі і ружовыя плечыкі ў блакітнай аправе, здавалася Пятрову,—былі асобнымі нотамі, гаммамі, гармоніяй гукаў, найпякнейшай у сьвеце сымфоніяй.

Верачка скончыла граць. Пятроў бачыў яе ўсьміхаючыся тварык і белыя бліскучыя зубкі.

Падышоў Аркадзь Паўлавіч і чамусьці, сумна ўсьміхаючыся, паднёс Пятрову келіх усьпененага шампанскага.

— Выпіце—коратка і з сумам сказаў ён—ва ўспамін былых перамог і паражэньняў.

Пятроў прыняў келіх. Тонкая крыштальная ножка іскрылася і здалася Пятрову нябывала крохкай.

— У расійскага інтэлігэнта — свае звычаі і дзіўныя, я-б сказаў, западабаньні... Мы, я хачу сказаць расійская інтэлігенцыя, часам містычны... Сёньнешнім вечарам я з году ў год п'ю ружовае шампанскае вось з гэтага келіха... І адкрыта заяўляю аб сваёй высокай павазе да яго!.. Гэта, ведаеце, старая бацькаўская спадчына!—Аркадзь Паўлавіч сказаў апошняе слова, падсьмейваючыся ўнутраным журботным сьмяшком.

Верачка, як і раней, усьміхаючыся глядзела на Пятрова. Белыя зубкі на фоне пунцовых губак асьляпляючы зьзялі.

— Верачка!—крыкнуў Пятроў, адчуваючы, што прымае тэатральную позу і не заўважваючы, што ўпяршыню, у прысутнасьці брата, называе Веру Паўлаўну Верачкай.—Расійская інтэлігенцыя баіцца ўсяго чырвонага, акрамя віна. Я-ж наадварот—баюся віна, а ўсё-ж яго п'ю!

Не чакаючы, пакуль нальлюць, Пятроў хутка наліў сабе другі келіх і выпіў.

Верачка, апусьціўшы вечка, накрыла белыя клявішы рояля.

Калі Пятроў зноў заўважыў Верачку, яна стаяла супроць яго, апіраючыся кончыкамі пальцаў аб край стала.

— Не,—сказала яна,—вы недаацэньваеце расійскую інтэлігенцыю,—і, адказваючы на ўласную, яшчэ ня выказаную думку, якая, мабыць, сама напрашвалася на язык — „вы недаацэньваеце расійскую інтэлігенцыю... з віду яна здаецца занадта трухлявай і, калі хочаце, няздольнай к моцным парывам, але на самай-жа справе яна ўпартая і можа змагацца за свае правы.

Аркадзь Паўлавіч зрабіў рух рукою, быццам хацеў сказаць, што ня трэба ўсяго гэтага. Але Верачка яго руху не заўважыла, ці не захацела заўважыць.

Не, расійская інтэлігенцыя тоіць у сабе больш выбуховых сіл, чым гэта здаецца!... Але яна можа хаваць да пары—да часу свае кіпцюры, сваю выбуховую сілу!—Яна гаварыла гучным голасам, і ў выказе слоў і ў самых словах адчувалася тая выбуховая сіла, аб якой яна гаварыла.

Пятроў глядзеў на яе са зьдзіўленьнем. Упяршыню бачыў яе ў такім запале і стала Верачка яму мілейшай, чым заўсёды. Залацістыя лёканы спадалі хваляй на блакітным шоўку плацьця.

Раней чым Пятроў змог прыдумаць удалае супярэчаньне. Аркадзь Паўлавіч паднёс яму келіх віна.

— Сядайма ў фотэль,—прапанаваў Аркадзь Паўлавіч.—Раскажэце аб якім небудзь цікавым усмаміне

Пад уплывам выпітага віна, раптоўна нахлынуўшых успамінаў, Пятроў выгадней усеўся ў фотэль, паклаў нагу на ногу і паглядзеў на Верачку. Яна стаяла каля стала і перабірала пальцамі зьвіслую махру сарвэты. Яна ужо ўсьміхалася Пятрову. Але ўсё-ж такі ён заўважыў, што прыжмураныя вочы яе блішчэлі зачэпна і ледзь-ледзь насьмешліва.

— Сапраўды,—сказала яна, усаджваючыся насупроць. — раскажэце што-небудзь!

— Запалеце цыгару!—сказаў Аркадзь Паўлавіч.—Я люблю, як нябожчык Аверчанка... запаліць цыгару... сесьці ў каміна, разагрэць свае костачкі, і ў воблаках густога араматнага дыму слухаць, слухаць без канца... У сутнасьці мы ўсе, усе яшчэ жывем романтыкай неразьвеяных дымаў.

Аркадзь Паўлавіч беражліва, як раней келіх паднёс Пятрову цыгару...

— На жаль, у нас няма каміна,—дадаў ён пасьмейваючыся ўнутраным усхваляваным сьмяшком. Відаць было, што яго сапраўды хвалюе тое, што нельга пасядзець ля каміна з цыгараю ў зубах.—Прыдзецца здаволіцца толькі цыгарай... ды яшчэ віном... Вы маеце рацыю... Мы вельмі любім віно... Гэта нам дапамагае забыцца і ўпякняе нашае жыцьцё... хе-хе!—дадаў ён, стараючыся здавацца вясёлым і бесклапотным. Але Пятроў разумеў, што Аркадзю Паўлавічу ў гэтую хвіліну зусім ня весела.

Лішак выпітага віна даваў сябе адчуваць. Галава зьлёгку кружылася. Саладкавата нылі выцягнутыя ногі. Адчуваўся рух крыві па целе. Даходзячы да пальцаў, кроў узьнімалася назад цёплай плыньню да грудзей. Сіняваты дымок цыгары тонкай ніткаю цягнуўся к столі. Аркадзь Паўлавіч задуменна глядзеў на дымок, а думкі кружыліся і цягнуліся за дымовай ніткаю.

Гады хутка несьліся назад. Цягнулася няпрыемная істужка ўспамінаў. Вось ён канчае ВНУ... Назад бягуць гады, поўныя нядолі... Галодны дзевятнаццаты год сядзіць жудасным ўспамінам... Ганебнае жыцьцё пры дапамозе струхнелых старых бацькаўскіх знаёмых... А вось і Кастрычнік—гэты страшны гураган, які зьнішчыў чароўны стары лад... Ён уварваўся злым драпежнікам... аголіў родную Расію, забіў бацьку... Жахлівы ўспамін сьмерці дарагога блізкага чалавека насунуўся гарачым камком к горлу Аркадзь Паўлавіча...

І, як гэта часта бывае, калі думкі двух людзей круцяцца вакол аднаго і таго-ж, Пятроў раптам успомінаў з асаблівай выразнасьцю працяг эпізоду недараскаванага на заводзкім вечары. Закрытая старонка, глыбока захаваная ў тайніках памяці сукрыта ад другіх падзей, раптам раскрылася сама сабою.

(Канец будзе)

Агняцьвет

## Турксіб

*Дзе дыхаюць прагна пустэчы*
*і горы,*
*Дзе шумна сьпявае чарот*
*І дзікія буры штурмуюць пра-*
*сторы,*
*Дзе ветры вядуць калаўрот,*
*Дзе енчаць пяскі і марнеюць*
*даліны*
*І крочыць засмажаны век—*
*З надзеяй ў свае пераможныя сілы*
*Прышоў будаўнік—чалавек...*
*І ў бойках сьпякотных змагаліс абшары,*
*А сонца палала ўгары.*
*І сэрца гарэла ў бурлівым па-*
*жары,*
*Змагаліс байцы—змагары...*
*Хвіліны плылі, рассыпаліс*
*бурштынам...*
*І раптам зьдзівіўся ўвесь*
*сьвет,—*
*Бо стукот музычны сталё-*
*вай машыны*
*Напоўніў прыціхнуўшы*
*стэп!..*
*І здаліс пустыні... Замоўклі*
*парогі...*
*А з сэрца зрываецца крык:*
*Яшчэ адна слаўная ў нас пе-*
*рамога!*
*Ура, наш савецкі Турксіб!*

## Па каляінах творчасьці*)

*(Па матар'ялах, дасланых у рэдакцыю)*

Часта вершы пачынаючых прасякнуты і нездаровымі, часам і шкоднымі, варожымі мотывамі. Прыкладам. Пятрусь Бядулін у вершы—„Зімой марознай“ выказвае думку, якую інакш, як нават кулацкай і нельга кваліфікаваць. Аўтар пралівае сьлёзы па старой вёсцы, якая адыходзіць у нябыт пад пераможным наступам новае, колектывістычнае вёскі:

„Вёска, вёска, МАЯ ДАРАГАЯ
(падкрэсьлена мною І. С).
Дажываеш апошні ты час,
Бо на зьмену радзілась
другая—
... Маляды сакавіты колгас“.

Называць вёску цемры, бядоты, вёску разгулу кулацкае эксплёатацыі бедняты, вёскай сваёй і дарагой, бязумоўна, зьяўляецца пераклічка з клясавым ворагам пролетарыяту, хоць мо' аўтар суб'ектыўна гэтага і не хацеў. Часам у некаторых пачынаючых праяўляецца і так званы „бязвусы энтузіязм“. Прыкладам А. Бурдзель у сваім вершы піша:

„Я ішоў самотны
берагам жыцьцёвым
Пранясьліс віхурай бураломy дні
толькі засталіся
перазвоны бомаў
Успамін шыпшына, як прайшлі яны“.

Як бачыце, аўтару ў часы нашай творчай эпохі, эпохі будаўніцтва соцыялізму няма радасьці жыцьцёвай, ён нідзе ня прыткнецца, бо: „пранясьліс віхурай буралому дні“, —гэта значыць годы грамадзянскай вайны з іх романтыкай. Усім носьбітам гэтых настрояў мы раім прыглядзецца добра да нашых тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, уліцца ў гэта будаўніцтва, аддаць яму ўсе свае маладыя сілы і толькі тады зьявіцца магчымасьць пазбавіцца ад такога суму, бо ўсе гэтыя нездаровыя мотывы зьявіліся ў выніку пахажваньня жыцьцёвымі берагамі і пасыўнага сузіраньня здалёку працы, якая рушыць увесь стары ўклад. Часта пачынаючыя аўтары даходзяць, у выніку сваёй агульнай няпісьменнасьці, да такіх ляпсусаў ці недарэчнасьцяй, што толькі прыходзіцца дзівіцца. Прыклад у вершы—„Вежы ў жалезы“ І. Галін піша:

„Будуем жыцьцё моналітаў“
(!).

Якое гэта „жыцьцё моналітаў“ і чым яно розьніцца ад жыцьця пролетарыяту і ад ўсяго наогул сучаснага жыцьця, дык аўтар, напэўна, і сам не ўяўляе. Або далей:

„Мы—
сыны бурлівых дзён краіны
Вежы сонцаў,
Вежы агняцьветаў
Гурбой здратуем (.) ужалезім“.

Скуль гэта т. Галін узяў, што „мы—сыны бурлівых дзён краіны“, будзем „гурбой здратоўваць“ і аднachасова „ужалезваць вежы сонцаў вежы агняцьветаў“? І як гэта ма[...] чыма, дык чытач напэўна ніяк н[...] ўявіць, ды і аўтар, думаю, катн[...] гэта для „прыгожага“ слаўца. Ляп-сус, недарэчнасьць відавочна[...] Трахім Ігнаценка ў вершы „Вясна“ піша:

Ўсюды чутны ЕНКІ (.!)
„Прышла, прышла вясна“.

Бачыце, тую радасьць, якую вы[...] казваюць усе з прычыны надых[...] ду вясны, аўтар уяўляе, як „енкі“. Думаю, што ня знойдзецца ніво[...] нага чытача, які-б паверыў Ігна[...] ценку.

Надзвычайна нездаровае зьяві[...] шча мы маем у тым, што вель[...] шмат вершаў ідэалізуюць на ўс[...] кія лады наогул „дарагую старо[...] ку“, наогул „родную Беларусь“. Пачынаючым неабходна ўсьвядо[...] міць, што наогул „Беларусь“ мо[...] быць і кулацкай Беларусьсю і пр[...] летарскай Беларусьсю. Менавіт[...] аб тым клясавым характары Бел[...] русі неабходна і не забыва[...] т.т. пачынаючым. Кулаку гэт[...] сама прыемна чуць словы—„Ро[...] ная Беларусь“. Гэту наогул са[...] бытную „Беларусь“ з вялікай а[...] лодай прыме і нацыянал-фашыст[...] і нацыянал-дэмакрат, і кулак[...] любы буржуа. „Родная“, „Дар[...] гая“, „Радзімая“, „Мілая і г. д. „[...] мабітная“ „Беларусь“—гэта ід[...] іхні. Вось чаму, каб об'ектыў[...] не пераклікацца з кулаком і [...] ідэолёгамі —нацыянал - дэмократ[...] мі, соцыял-фашыстымі—разьмеж[...] ваньне паняцьцяў „Беларусі“ пр[...] летарскай і кулацкай павінны ч[...] вонай істужкай пранізваць [...] думкі, ідэі творчасьці пачына[...] чых.

Нязначная колькасьць разгл[...] джаных вершаў характэрна і [...] ўсяе астатние масы творчасьці [...] чынаючых. Заканчваючы на [...] гоньня наш кароткі агляд, мы [...] вінны напомніць т.т. пачынаючы[...] лёзунг БелАПП'у—вучоба, тв[...] часьць, самакрытыка. Вось, то[...] выходзячы з гэтай асноўнай ус[...] ноўкі і павінны працаваць па[...] наючыя пісьменьнікі. Павышаю[...] агульны ўзровень ведаў, вучач[...] пісаць у старэйшых, ужо вядо[...] пісьменьнікаў, шляхам чысткі [...] ларускіх літаратурных часопіс[...] як „Маладняк“, „Узвышша“, „П[...] лыма“, кніг, крытычна ўсвойва[...] чы іх дасягненьні, упарта прац[...] чы над сабой, над сваімі твор[...] крытыкуючы іх шляхам на[...] джваньня літаратурных дыспу[...] сярод рабочай моладзі, прыс[...] хоўваючыся сяброў і г. д. І, [...] паўтараю, толькі ўпарта прац[...] чы, можна прысылаць тады с[...] творы і ў рэдакцыю: Лепшае [...] з іх будзе, бязумоўна, друкав[...] ца. Сьпешкі, паўтараю, з прыс[...] кай матар'ялу не павінна мец[...] Гэтак сама неабходна ўсім д[...] шчыкам літаратурнае старо[...] пільна сачыць за ўсімі нашымі [...] радамі пачынаючым.

Ул. СЯДУРА.

*) Канец. Пачатак гл. у № 95.

## ТУРКСІБ—СЬЦЯГ НОВЫХ ТЭМПАЎ

25 сакавіка 1930 г. на станцыі Айне-Булак адбылася змычка паўночнага і паўднёвага вучасткаў Турксібу,—аднаго з гігантаў новага соцыялістычна[...] будаўніцтва СССР. Рэгулярны рух па Турксібе адчыняецца 15 мая. Асноўныя работы па будаўніцтву Турксібу пачаліся ў 1927 годзе. Тэрмін пабудовы бы[...] установлены 5-гадовы. Пасьля гэтага тэрмін быў скарочан урадам на год і аднесен к канцу 1931 году. Аднак, дзякуючы высокаму працоўнаму энтузіязму ўся[...] колектыву работнікаў Турксібу, будаўніцта скончылася на год раней тэрміну, вызначанага апошнім, зацьверджаным урадам, плянам. Даўжыня Турксібу [...] Сямапалацінску да станцыі Лугавой (сярэдняя Азія)—1442 кілёмэтры. Кошт будаўніцтва вызначаны ў 203707 тысяч рублёў. Аднак, гэты кошт быў зьніжан [...] 175 мільёнаў рублёў.

НА ЗДЫМКУ зьлева направа: 1. Змычка шляхоў. Завінчваюць апошнюю гайку. 2. Казачкі вітаюць адчыненьне Турксібу. 3. Тав. Шатаў зачытвае рап[...] аб змычцы паўднёвага і паўночнага вучасткаў шляху. 4. Тав. Рыскулаў—намесьнік старшыні СНК РСФСР зачытвае сьпіс асоб, падлягаючых узнагаро[...] ордэнам працоўнага Чырвонага Сьцягу. 5. Тав. Ісаеў—старшыня Савету Народных Камісараў Казакстану—на адчыненьні Турксібу.

**Выяздная рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ на віцебскім скурзаводзе**

# Горы браку і тысячы дарма патрачаных гадзін

## Кучы сапсаванай продукцыі і сыравіны, доўгая істужка марна патрачанага часу, безгаспадарнасьць і бясплянавасьць затуляюць ініцыятыву і тармозяць выкананьне прамфінпляну

## Рабочыя скурзаводу! праяўляйце больш упартасьці і настойлівасьці ў справе выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну

## Выяздная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ прыступіла да агляду заводу. Стварайце рабкораўскія брыгады і пасты! Мобілізуйце „лёгкую кавалерыю“! Удзельнічайце у аглядзе!

На ваколіцы гораду, над ра-й, сярод невялічкіх будынкаў, ...скінуўся Віцебскі скурзавод, які мінулым годзе некальні разоў ...эў і ў апошні раз ненасытны ...онь зьеў яго нашчэнт, аставіўшы толькі дымныя руіны і сіратлівыя абгарэлыя слупы. Гэта было раней... А зараз адбудаваны на...ва, абсталяваны па-новаму. Прыводныя рамяні і шківы мільгацяць шалёным рознатахтным танцы, ...біваюць дроб штамповачныя ...рштаты, задорна пабліскваючы ...ымі часткамі, як-бы гавораць: ...та было раней...

### ...ьняць з чорнай дошкі

Перад рабочымі стаіць баявая ...дача—зьняць завод з чорнай ...шкі, куды ён быў занесены га...зкім саветам 2-га сакавіка за ...выкананьне прамфінпляну. Важ...йшая дырэктыва аб зьніжэньні ...бекошту за 1-е паўгодзьдзе за...дам значна недавыконвываецца ...ае нават павялічэньне сабекошту па заводзе ў сярэднім на 4 пр. ...творчая програма па краснадубільным цэху за мінулае паўгодзьдзе ў колькасных паказальніках ...замочцы скур выканана на 99 пр., ...выпуску гатовай прадукцыі— 105 проц., по штамповачным ...ху—на 106 проц. У вагавых паказальніках па замочцы сыравіны ...ограма выканана ўсяго на 94 пр. ...програме вага аднае скуры па...на быць 17,5 кілёграм, а завод ...пушчаў па 15,8.

Па выпуску гатовай продукцыі ...ограма выканана на 94 пр. Про...т выхаду гатовага тавару з ...ра-салёнай сыравіны замест ...проц. атрымаўся ўсяго 93 проц., ...творчая програма за краса...м-ц выканана толькі на 75 пр., ...нават і недавыкананьне про...ы на 25 проц. не змагло пры...ць увагі партыйных, комса...льскіх і профсаюзных організа...й да справы выпраўленьня пра...ву. На заводзе працуе 486 ра...чых, з якіх у соцспаборніцтве ...дзельнічае толькі 150 чал. што скла...е ўсяго 30 проц. агульнай кольк...сьці рабочых (лічбы недакладн...я). Партыйцаў у соцспаборніцтве ўдзельнічае 64 проц., комса...льцаў 72 проц.

### ...б чым гавораць лічбы

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, ...то сапраўднай растлумачальнай ...боты аб мэтах і задачах соцспаборніцтва сярод рабочых не вя...сі, што маса да гэтага часу не ...разумела, што: „соцспаборніцтва ёсьць комуністычны мэтад ...удоўлі соцыялізму на грунце ...ксымальнай актыўнасьці мільённых мас працоўных“ (Сталін), што: „спаборніцтва ёсьць ...ой рычаг, пры дапамозе якога ...бочая кляса прызвана пера...рнуць усё гаспадарчае і культурнае жыцьцё краіны на ба... соцыялізму“ (Сталін). А кі...ўнікі заводу лічаць, што спаборніцтва—гэта чарговая кампанія і ...усім невыпадкова, што ў выніках ...раверкі гаспадарча-політычнага ...агавору часовая кантрольная ка...місія піша: „спаборніцтва па лі...і павышэньня норм выпрацоўкі пачалася 3-VШ і працягвалася да 1-IX“. Гэтая вынятка па...ывае наколькі скажаюцца пра...ільныя разуменьні сапраўднага ...спаборніцтва. Належыць адзна...чыць, што парторганізацыя заво...ду не направіла свае сілы на раз...гортваньне соцыялістычнага спаборніцтва, яна не змагла стаць на ...аде ўздыму мас.

Бясплянавасьць, нядбайнасьць, безгаспадарнасьць, дрэнная организацыя кіраўніцтва вытворчасьцю, праца на-авось—асноўныя прычыны прарыва ў асобных звеньнях заводу—цэхах-брыгадах.

На заводзе ляцяць у трубу дзесяткі і нават сотні рублёў з прычыны таго, што няма рацыянальнага выкарыстоўваньня сыравіны, ...алу, абсталяваньня. Брак, пра...оі, прагулы за 1-е паўгодзьдзе ...дасягаюць па красны-дубільнаму ...эху 188 чалавека-дзён, што скла...ае 6,62 проц. ад агульнай кольк...асьці адпрацаваных чалавека-дзён, і па штамповачным цэху—202 чалавекі-дні ці 4,87 проц. адпрацаваных чалавека-дзён, што зрывае выкананьне колькасных паказальнікаў прамфінпляну і высоўвае зараз на першы плян патрэбнасьць абвяшчэньня жорсткай барацьбы са стратамі на вытворчасьці і безадкладнага ўзмацненьня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў на заводзе.

**Комсамольская організацыя заводу нічога ня робіць у гэтым напрамку.**

### Рэальнага павялічэньня ня было

Ленінскі заклік ударнікаў, абвешчаны ВЦСПС і ЦК УсеЛКСМ, на скурзаводзе не знайшоў належнага ажыцьцяўленьня. Заклік ня даў рэальнага павялічэньня рабочых ва ўдарніцкім руху, з прычын дрэннай організацыі ўдарнікаў вакол гэтага пытаньня, вакол барацьбы выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, за павышэньне вытворчасьці працы, зьніжэньне сабекошту, палепшаньне якасьці прадукцыі і інш.

Важнейшая дырэктыва ЦК УсеКП(б) ад адзінаначальлі, без правядзеньня якой немагчыма палепшаньне кіраўніцтва вытворчасьцю, на заводзе ўсьвядомлена яшчэ нездавальняюча. Значэньне адзінаначальля рабочымі ня ўцямлена, з прычыны недастатковай растлумачальнай працы. На заводзе яшчэ няма пэўнай увязкі ў рабоце зьмен, правільнага разьмеркаваньня рабочай сілы, тэхнічных кіраўнікоў. Завод зараз перашоў на 7-гадз. рабочы дзень, што патрабуе ад усіх заводскіх організацый асаблівай чуткасьці і тэрміновага скарыстаньня ўсіх магчымасьцяй, якія ўсплываюць у сувязі з пераходам на 7-гадзінны рабочы дзень.

### Вытворчыя нарады бяз мас

Рашучага пералому ў рабоце профорганаў да гэтага часу яшчэ няма. Работа вытворчых камісій і нарад за пэрыод кастрычнік-лістапад праходзіла зусім слаба. З сьнежня месяца наглядаецца некаторае ажыцьцяўленьне іх работы. Большасьць разглядаўшыхся пытаньняў закранала выкананьне прамфінпляну, але, на вялікі жаль, у работу вытворчых камісій і нарад рабочая маса ўцягнута ня была, аб іх рабоце рабочыя ня ведалі, бо аб дні паседжаньня нарад абвяшчэньня не рабілася. Пастановы вытворчых камісій і нарад нідзе ня вывешваліся. Трэба адзначыць, што вытворчыя нарады ня выконвалі сваёй ролі—баявых штабаў соцыялістычнага спаборніцтва, не выкарыстоўваўся імі таксама ўздым творчай ініцыятывы, ахапіўшы самыя шырокія колы беспартыйных рабочых, што спрыяла-б паслабленьню і нават зрыву спаборніцтва сярод рабочых заводу.

І усе „патугі“ ў пустую

### З сыравінай дрэнна

Нельга абыйсьці моўчкі нядбайныя адносіны Скуртрэсту да забясьпечаньня заводу патрэбнай сыравінай згодна заключанаму паміж трэстам і заводам дагавору. Трэст забясьпечвае завод сыравінай у колькасных паказальніках з перавышкаю, але вага яе, у параўнаньні з патрабаваньнямі заводу і дагавору, значна нясходзіцца. Так, за мінулае паўгодзьдзе ўсяго завод атрымаў сыравіны, у параўнаньні з програмай, у штуках—105 проц., у вагавой колькасьці—94 проц., прычым лёгкай сыравіны ў штуках было атрымана: 115 пр., у вагавой колькасьці 100 проц. Важкай сыравіны ў штуках было атрымана 92 проц., а ў вагавой колькасьці толькі 83 проц. Ня гледзячы на тое, што пытаньне аб якасьці прысылаемай трэстам сыравіны, некалькі раз разглядалася на вытворчых нарадах, усё-ж яшчэ яна не ўрэгулявана, а адсюль—і пастановы вытворчых нарад яшчэ ня выкананы. Сыравіна паступае на завод з вялікімі прырэзамі мяса, адсюль—дэзорганізацыя процэсаў вытворчасьці, з прычыны павялічэньня часу апрацоўкі скур, падзеньня вытворчасьці працы, бо прыходзіцца павялічваць рабочую сілу, паніжаецца выхад гатовага тавару і павялічваецца сабекошт.

У партыях сыравіны, што паступаюць на завод, скура падабрана неаднолькавай шчытнасьці, яна не адпавядае распарадку, зацьверджанаму Белскуртрэстам і Белкантарай Віцебскага Скурсындыкату. У выніку скуры няроўнамерна прадубляюцца, што адбіваецца на якасьці гатовага тавару.

Прастоі на заводзе вельмі адчуваюцца, асабліва па штамповачным цэху. За пяць месяцаў мінулага паўгодзьдзя штамповачны цэх мае 3727 чалавека-гадзін прастою, што складае 10,96 проц. ад агульнай колькасьці прапрацаваных гадзін. Па краснадубільным цэху прастояў трохі меней—1029 чалавека-гадзін, ці гаворачы мовай процантаў,—7,51. Адсюль выходзіць, што штамповачны цэх за час прастояў у частцы абутковай вытворчасьці недавыпрацаваў 71744 пары. Краснадубільны цэх недавыпрацаваў 4630,5 кілёграм гатовага тавару, што дало заводу значныя страты, якія налічваюцца тысячамі рублёў.

### Змагацца за якасьць

У штамповачным цэху наглядаюцца перабоі ў своечасовым забясьпечаньні цэху адпаведнымі асортымэнтамі сыравіны, дзякуючы чаму часты перабоі ў рабоце, заторы, а гэта адбіваецца на вытворчасьці працы, якасьці выпушчаемай продукцыі і парушае нормальны ход работы цэхаў.

Ранжырыстыя рубяць тавар, які не адпавядае стандартным асортымэнтам, дзякуючы невыстарчальнаму кіраўніцтву імі і адсутнасьці адзінага кіраўніцтва па рубцы, выходзячы з умоў атрымоўваемай сыравіны, што адбіваецца на якасьці і правышае нормальны процант браку, у прыватнасьці пры рубцы флекаў. Акілы, якія ідуць на штамповку набоек, не сартуюцца. Набойкі рубяцца як папала і з рознага тавару.

Падэшвы для вялікіх нумараў ботаў кроюцца з тонкага тавару, а на маленькія—з болей важкага тавару. Раскроеныя дзялянкі мяняюцца з мужчынскіх на жаночыя падэшвы. Ёсьць многа аднабокіх дзялянак, якія рубяцца на падэшвы, тады як можна было-б адрубіць частку для дзіцячых падэшваў, а рэшту пусьціць на сьцелькі. Няма цьвікоў для замацаваньня абсацаў і прыходзіцца іх замацоўваць некалькі раз, ад гэтага абсац выходзіць няправільны. Адходы ад мужчынскіх флекаў не выкарыстоўваюцца на жаночыя флекі, а кідаюцца ў звал. Тавар на ранты выкарыстоўваецца няправільна.

Тавар, які можна было-б скарыстаць больш рацыянальна для іншых процэсаў, даецца на ранты, што павялічвае адходы і брак. Адходы, якія перадаюцца Скурсындыкату, можна выкарыстоўваць у штамповачным цэху, але гэтага ня робіцца. Было-б вялізарнейшай памылкай, калі-б мы шукалі прычын зрыву прамфінпляну выключна ў вышэйзазначаных недарэчнасьцях—забясьпечанасьці сыравінай і інш. Яны ні ў якай меры ня могуць служыць на колькі-небудзь абгрунтаванымі прычынамі для тлумачэньня тых прарываў, якія на сёньняшні дзень мае скурзавод.

Карэньні гэтых ганебных прарываў крыюцца глыбей—у недаацэнцы ролі соцыялістычнага спаборніцтва пры дапамозе якога можна было-б запоўніць прарывы, у слабым удзеле ў ім шырокіх колаў рабочых, у недавядзеньні прамфінпляну да варштатаў і мас рабочых, якія працавалі ўсьляпую, не ведаючы, што ад іх патрабуецца, у адсутнасьці барацьбы з прагуламі, прастоямі, стратамі на вытворчасьці, расхлябаннасьцю, безгаспадарнасьцю, у шэрагу няправільнасьцяй, дапушчаных усімі заводзкімі організацыямі ў штодзённай практычнай рабоце і інш.

### Ня толькі прызнаць, але і выправіць

Партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя організацыі заводу належным чынам не мобілізавалі рабочую масу на зьнішчэньне прарываў, яны штосьці гаварылі, запісвалі, але конкрэтна амаль што нічога не зрабілі, прызналі толькі правільнасьць занясеньня заводу на чорную дошку і на гэтым супакоіліся. Завод ужо больш 2 месяцаў знаходзіцца на чорнай дошцы, але да гэтага часу ён яшчэ нічога не зрабіў, каб змыць з сябе гэтую ганебную чорную пляму, а наадварот,—яшчэ паглыбіў свае прарывы, чым забясьпечыў сабе месца на чорнай дошцы і надалей.

**Віт. СІДАРУК.**

Ударнае „змаганьне“ за прамфінплян

**На заводзе „Чырвоны Мэталіст“**

## Пасьмяшылі і людзей насьмяшылі

Чаму разваліласся брыгада-комуна № 1 дрэваапрацовачнага цэху? Каб адказаць на гэтае запытаньне, трэба раней расказаць, як яна організавалася. Цэхпрофбюро, не растлумачыўшы рабочым мэтаў комуны і ня ўлічваючы таго, што ў цэху маюцца рабочыя з заработкам у 150 рублёў і заработкам у 80-90 рублёў—абавязала ўвесь цэх уступіць у комуну.

І атрымалася, што рабочыя з вышэйшым заработкам зьнізілі інтэнсыўнасьць працы. Напрыклад: ударнік Казлоў да ўступленьня ў брыгаду-комуну рабіў 60 веялачных сьценак у дзень, а ў брыгадзе больш чым 40 не рабіў. Інструктар цэху тав. Ісьянаў спачатку абяцаў скласьці ўмовы для брыгады комуны, бесьперабойна забясьпечваць паўфабрыкатамі на 80-90 веллак у дзень. На справе-ж комуна атрымлівала паўфабрыкату на 65-70 веялак.

Дзякуючы склаўшамуся становішчу, уся брыгада пачала працаваць горш, значна зьнізіўшы вытворчасьць працы, а дзеля гэтага, зразумела, зьніжаўся і заработак аж на 15 проц. У брыгадзе зьявіліся людзі, якім ня было чаго рабіць цэлымі днямі. Яны бегалі ад аднае работы да другое і ў выніку нічога не атрымлівалася.

Адбілася на рабоце комуны і слабасьць брыгадзіра, які ня меў патрэбнай настойлівасьці для таго, каб дабіцца належных умоў для работы комуны. Гэтак, нядаўна праіснаваўшы, наша першая брыгада-комуна разваліласся, не пакінуўшы пасьля сябе ніякіх сьлядоў.

**Член юнкораўскай брыгады „Ч. З.“ С. ВАЛЧОК.**

## Не павярнуліся тварам да вытворчасьці

### Вязынь-Фаніпальская і Ружампольская ячэйкі яшчэ не перабудавалі сваёй працы

Пастановы ЦК ЛКСМБ аб павароце ячэек тварам да вытворчасьці яшчэ ня усюды атрымалі належнае практычнае ажыцьцяўленьне. Шэраг ячэек і да гэтага часу зусім ня ўдзельнічае ў жыцьці свайго саўгасу, колгасу,—асабліва гэта назіраецца ў саўгаскай ячэйцы Фаніпаль (Самахвалавіцкі р.).

Савгас Вязынь-Фаніпаль мае вялікія прарывы: бесгаспадарнасьць, адсутнасьць усякага кіраўніцтва з боку кіраўнікоў, папяровае ўдарніцтва. Ніводзін комсамолец не зьяўляецца ўдарнікам, сярод трыкутніку—склокі і г. д. Усё гэта комсамольская ячэйка бачыла, але не рэагавала, мотывіруючы тым, (сэкратар ячэйкі), што гэта—справа не комсамольскай ячэйкі, а толькі партыйнай.

Другі прыклад адмоўнай працы ячэек у гаспадарчым будаўніцтве савгасу падае Ружампольская ячэйка (Койданаўскі раён), дзе таксама ніводзін комсамолец не ўваходзіць ва ўдарныя брыгады. Ячэйка не займаецца пытаньнямі гаспадарчага становішча савгасу, тлумачачы тым, што ў ячэйцы ўсе комсамольцы маладыя.

Гэтыя факты нядбайных адносін да гаспадарчага будаўніцтва колгасу Фаніпальскай і Ружампольскай ячэек сьведчаць аб тым, што асобныя вытворчыя ячэйкі на вёсцы (савгасы, колгасы) не змаглі да гэтага часу перабудаваць сваёй працы. А гэта прыводзіць да таго, што пасеўная кампанія па шэрагу савгасаў і колгасаў праходзіць без належнага актыўнага ўдзелу і дапамогі комсамольскіх ячэек.

На прыкладзе гэтых ячэек астатнія комсамольскія організацыі і ячэйкі павінны ўлічыць і выправіць свае прарывы.

**З. Б.**

# Патрабуем тэрміновага разгляду справы

## аб самагубстве студэнткі-комсамолкі Касаковіч

Гэта было 15 лютага 1930 году, калі ўвесь Марына-Горскі садова-агародны тэхнікум маланкай абляцела вестка, што студэнтка другога курсу тав. Касаковіч скончыла жыцьцё самагубствам. З тэхнікуму праз некалькі дзён паведамілі Пухавіцкі РК КП(б)Бі'ў Менск—інспэктару Наркомасьветы тав. Лазарэнку.

Самагубства Касаковіч пасьля некаторага часу прыцягнула ўвагу розных організацый і сьледчых органаў.

Організацыі самога-ж тэхнікуму пасьля гэтага здарэньня ніякіх захадаў да расьсьледваньня не прынялі і, больш таго,—на працягу двух месяцаў не паведамілі ЦБ Пролетсуду і іншыя організацыі.

Хто-ж такая Касаковіч? Чаму яна скончыла жыцьцё самагубствам?

Касаковіч—сялянка-беднячка, член комсамолу з 1926 году.

Паступіўшы ў тэхнікум у 1929 годзе, яна своечасова выконвала акадэмічныя запатрабаваньні, вяла актыўную барацьбу за якасьць вучобы, выступаючы супроць нядбайных адносін часткі студэнтаў і студэнтак да вучобы.

Разам з гэтым Касаковіч была актыўнай корэспондэнткай у насьценнай газэце тэхнікуму. У сваіх допісах і выступленьнях на сходах з усёй рашучасьцю крытыкавала адміністрацыю тэхнікуму, асобных студэнтаў. Яна рашуча выступала супроць зрыўшчыкаў соцспаборніцтва, супроць сямейнасьці ў тэхнікуме.

Касаковіч праз насьценную газэту выклікае групу вучняў на соцспаборніцтва з мэтай хутчэйшай здачы залікаў і заданьняў выкладчыкаў. У сваім выклічу яна бярэ на сябе таксама абавязак наведваць без спазьненьняў усе сходы комсамольскай ячэйкі, паседжаньні і нарады, да якіх яна мела дачыненьне.

Гэта не спадабалася частцы студэнтаў і студэнтак, яны пачынаюць яе цкаваць, прыгаварваючы;—„не твая справа маралі чытаць нам, табе гэтага ніхто не даручыў", называюць яе „штрэйкбрэхэрам", „выскачкай" і г. д.

Трэба адзначыць, што шэраг "каштоўных допісаў рэдколегія не зьмясьціла толькі дзякуючы таму, што Касаковіч рашуча крытыкавала, не зважаючы на асобы.

Гэты факт гаворыць аб тым, што рэдколегія садзейнічала заціску самакрытыкі. Рэдколегія таксама не праводзіла праверкі рэагаваньня на заметкі з боку адпаведных організацый і адміністрацыі тэхніку.

У сувязі з рашучай крытыкай на Касаковіч пачынаюцца ганеньні. У насьценгазэце зьяўляюцца беспадстаўныя компромэтуючыя Касаковіч заметкі. Яе цкуюць за тое, што... яна добра вучыцца, што яна знаёміць прыяжджаючых студэнтаў і студэнтак першага курсу і сьпіць з-за іх тры гадзіны ў суткі... (допіс „Заняткі ў хэмічнай").

Цкаваньні прымаюць вышэйшую форму ў сувязі з прапажай рэчаў у студэнтак першага курсу, якія былі знойдзены пад матрацам у Касаковіч.

Праз месяц складаецца думка, што гэтыя рэчы ўкрала Касаковіч. Гэтыя факты не пацьвердзіліся. Сама Касаковіч у сваім лісьце перад самагубствам разглядае гэта, як адзін з прыёмаў цкаваньня яе.

Камісія з прадстаўнікоў Наркамасьветы, ЦБ Пролетсуду, ЦСПСБ, саюзу Сельска-гаспадарчых і лясных рабочых па расьсьледваньню справы аб самагубстве Касаковіч у сваіх вывадах адзначыла, што нездаровая атмосфэра навокал Касаковіч стварылася з прычыны гарачай крытыкі з боку Касаковіч хваравітых зьявішчаў у тэхнікуме, не зважаючы на асобы.

Калі камісія паставіла свае вынікі на агульным зачыненым партыйна-комсамольскім сходзе, дык апошні ня прызнаў сваіх памылак. Замест таго, каб завастрыць увагу ўсяго студэнцтва на нермальнасьцях ў тэхнікуме сход прыняў політычна-шкодную пастанову, якая змазвае політычную сутнасьць справы і сьведчыць аб нежаданьні прызнаць свае памылкі. Трэба пры гэтым адзначыць, што сэкратар партячэйкі, дырэктар тэхнікуму і старшыня профкому да апошняга часу ўпарта не прызнавалі сваіх памылак.

Партячэйка, профком і адказныя кіраўнікі—партыйцы тэхнікуму не зразумелі і недаацэнілі сутнасьці клясавай барацьбы і не ўсьвядомілі мэтадаў барацьбы кулацтва, перанесеных у нашы навучальныя ўстановы, як барацьбу за зрыў новых пролетарскіх кадраў для соцыялістычнай гаспадаркі.

Рашуча адсуджаючы ўчынак Касаковіч, якая да канца ня змагла змагацца і давесьці справу да канца, мы патрабуем ад Наркомасьветы зьняць з работы дырэктара тэхнікуму Глушаноўскага і інспэктара Наркамасьветы Лазарэнка, які своечасова быў інформаваны аб самагубстве і ня прыняў патрэбных захадаў да тэрміновага расьсьледваньня справы, не паведаміў адпаведныя органы, тым больш, што Касаковіч выкрывала яго недахопы пры чыстцы партыі (ён у той час быў дырэктарам тэхнікуму).

Да гэтага часу ня скончана сьледзтва па справе самагубзтва Касаковіч, трэба, каб прокуратура рэспублікі прыняла захады да хутчэйшага сканчэньня сьледзтва, надаўшы справе політычны напрамак, выкрыць вінаваўцаў самагубства і асоб, якія заціскалі самакрытыку, прыцягнуць іх да суровай адказнасьці.

**Х. Бацьвіньнік**

# Не аўладалі зброяй самакрытыкі

Зьлёт ударнікаў Кастрычнікаўскай організацыі сабраўся ў дзень першай гадавіны соцспаборніцтва. Гэта ўжо акрэсьлівае зьмест і напрамак працы зьлёту. Ён павінен быў падвесьці вынікі працы комсамолу раённай організацыі на гаспадарчым фронце, павінен быў адлюстраваць усю працу комсамолу і пад яго кіраўніцтвам—усяе рабочай моладзі на вытворчасьці.

### Гаварыў тав. Галадзед

Пачалі зьбірацца. Гутарка, шум напоўнілі залю дому Комасьветы. Са спазьненьнем на гадзіну—другую зьлёт распачаў сваю працу. Тав. Галадзед робіць даклад аб чарговых задачах соцбудаўніцтва і ўдзеле ў ім комсамолу. На сёньнешні дзень—гаворыць тав. Галадзед,—перад нашай краінай галоўнай задачай зьяўляецца выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, выкананьне прамфінпляну кожнага паасобнага прадпрыемства. Моладзь, як больш энэргічны элемэнт, павінна быць і была ініцыятарам, застрэльшчыкам соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Дзеля таго, каб быць перадавіком на вытворчасьці трэба мець тэхнічныя веды. Комсамол павінен пайсьці ў бой за набыцьцё тэхнічных ведаў, за аўладаньне сакрэтамі вытворчасьці. Комсамол, ідучы наперадзе соцспаборніцтва, павінен уладаць зброяй самакрытыкі, каб выкрыць тых, хто перашкаджае працаваць, выкінуць з сваіх шэрагаў здраднікаў соцбудаўніцтва, аўладаць самакрытыкай, каб выправіць свае ўласныя памылкі.

Далей тав. Галадзед застанаўліваецца на становішчы вытворчасьці Беларусі. За першае паўгодзьдзе 1929-30 гаспадарчага году прамфінплян па прамысловасьці БССР выкананы на 94 проц., там дзе прадпрыемствы далі падвышэньне вытворчасьці працы, мы адначасова маем зьніжэньне якасьці продукцыі. Гэта становішча сьведчыць аб тым, што на некаторых прадпрыемствах недастаткова разгорнута соцспаборніцтва, гаворыць аб наяўнасьці гаспадарчых прарываў. Прадпрыемствы, якія недавыканалі прамфінплян, ёсьць і ў вашым раёне і віна за невыкананьне прамфінпляну ўскладаецца і на комсамольскую організацыю. Вы сабраліся сёньня на зьлёт і тут, на зьлёце, вы павінны выявіць працу комсамольскіх ячэек тых прадпрыемстваў, якія недавыканалі прамфінплян, падзяліцца вопытам працы тых комсамольскіх ячэек, якія пасьпяхова выканалі свае абавязкі перад прадпрыемствам. Надалей комсамол павінен пакласьці ўсю сваю энэргію на ліквідацыю прарываў. Скончыцца праца зьлёту і вы разыйдзецеся па прадпрыемствах і там, ля варштату, вы павінны будзеце выконваць тое, аб чым мы гаварылі тут.

### Але лёгічнага працягу ня было

Але далейшая праца зьлёту зьяўляецца лёгічным працягам таго, аб чым гаварыў тав. Галадзед. Уся дзелавая праца зьлёту працягвалася тры гадзіны. З гэтае прычыны ня было магчымасьці досыць сур'ёзна падысьці да вырашэньня пастаўленых перад зьлётам пытаньняў.

Рапартуе абутковая фабрыка.

На фабрыцы ўдарны рух зарадзіўся па ініцыятыве комсамолу. З ударнай брыгады ў тры комсамольцы вырасла 57 ударных брыгад, у якія ўваходзяць 527 рабочых, а цяпер уся фабрыка абвясьціла сябе ўдарнай. Ударнікі дабіліся досыць значных посьпехаў у працы.

Сярод ударнікаў гэтай фабрыкі было выкрыта 30 проц. лжэ-ударнікаў. Чым-жа тлумачыцца гэткі вялікі процант лжэ-ударніцтва?

Чаму ўдарная брыгада недавыканала прамфінплян і была занесена на чорную дошку? Гэтага зьлёт ня высьветліў, ня даў ацэнкі працы комсамолу фабрыкі.

Наяўнасьць 30 проц. лжэ-ударнікаў сьведчыць аб тым, што ўдарніцкі рух фабрыкі ня быў падрыхтаваны. Ударніцтва было папяровае. А дзе быў комсамол? Яго штодзённай растлумачальнай працы сярод рабочых аб ударніцтве і соцспаборніцтва ня было.

Чаму чырвонаштандартны „Бальшавік" недавыканаў прамфінплян, даў дрэнную продукцыю, шчацінная ф-ка выканала прамфінплян на 57 проц., „Адраджэньне" зусім ня мае прамфінпляну, зорганізаваныя вельмі слабыя ўдарныя брыгады, нічым ударным не вызначаюцца? Аб гэтым дагэтуль не сыгналізаваў, а калі аб гэтым было сказана з трыбуны зьлёту, дык ўвагі зьлёту не атрымала. Гаварылі аб усім у сусьветным маштабе, а аб штодзённым канкрэтным удзеле ў гэтым раённай організацыі комсамолу... забыліся. Ці апраўдала комсамолія Кастрычнікавага раёну званьне ініцыятараў соцспаборніцтва і актыўных удзельнікаў соцбудаўніцтва—зьлёт ня высьветліў, ня даў адказу на гэтае асноўнае, пастаўленае перад ім, пытаньне. Удзельнікі зьлёту ня ведаюць якім шляхам комсамольцы „Энэргіі" перашлі ад недавыкананьня прамфінпляну ў першым паўгодзьдзі 1929-30 гаспадарчага году на 20 проц.—да перавыкананьня яго ў другім паўгодзьдзі. Самакрытыка ня стала сродкам выяўленьня дрэнных бакоў сваёй працы.

Творчы ўздым рабочай моладзі выліўся у створаных ударных брыгадах, у баявой рыхтоўнасьці да змаганьня за промфінплян, за выпраўленьне прарываў, якія былі на некаторых фабрыках і заводах. Гэты ўздым гарантуе далейшыя посьпехі.

**Юнкоры 13. С. і Еф. К.**

# Да ўсіх ячэек ЛКСМБ,

## РЭДАКТАРОЎ НАСЬЦЕНГАЗЭТ І КОМСАМОЛЬСКІХ СТАРОНАК У ШМАТТЫРАЖКАХ

Зьмяшчаючы ніжэй апросны талён, рэдакцыя зьвяртаецца да ўсіх ячэек з просьбай запоўніць і даслаць яго ў рэдакцыю

ВЫРЭЖ

**ТАЛЁН**

1. Назва і адрас прадпрыемства ..........
2. Назва насьценгазэты альбо шматтыражкі ..........
3. Прозьвішча і адрас рэдактара ..........
4. Колькі раз у месяц выдаецца ..........

Подпіс рэдактара ..........

ЗАПОЎНІ

ДАШЛІ Ў РЭДАКЦЫЮ „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА"

# Сход экскурсантаў едучых на Украіну

СЁНЬНЯ АДБУДЗЕЦЦА СХОД ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ У ЭКСКУРСІІ ПА МАРШРУТУ

ГОМЕЛЬ-КІЕЎ-ДНЕПРАБУД,

ПРАЖЫВАЮЧЫХ У ГОРАДЗЕ МЕНСКУ.

Сход адбудзецца ў памяшканьні Дому Комсамолу—чытальня (Комсамольская, 25). Пачатак а 8-й гадзіне. Просьба прысьці своечасова.

ЭКСКУРСІЙНАЯ КАМІСІЯ «Ч. З.»

# Выстаўка друку

Габінэт журналістыкі Комуністычнага Унівэрсытэту Беларусі ў. І. Леніна пры актыўным удзеле і дапамозе: Беларускага Газэт[...] Бюро, Сэкцыі Працаўнікоў Друку, Камітэту па справах друку, Цэн[...] архіву, Бюро Міжнароднае Сувязі пры Беларускім Камітэце С[...] Эспэрантыстых Савецкіх Рэспублік, Дзяржбібліотэкі Музэю Рэвол[...] і Пушкінскай Бібліотэкі наладжвае Выстаўку Друку.

Выстаўка заключае ў сабе звыш 2000 экспонатаў і разьбіва[...] на аддзелы, галоўнымі з якіх зьяўляюцца:

1) Рэвалюцыйны друк да 1917 году,
2) Бальшавіцкі друк да 1917-1922 г. г.,
3) Друк СССР на 1930 г.,
4) Замежны рэволюцыйны легальны і нелегальны друк,
5) Аддзел МОПР'у,
6) Аддзел Міжнароднае Рабочае Сувязі,

Выстаўка зьмяшчаецца ў памяшканьні Комвузу (другі па[...] пак. 25-26) і будзе працаваць штодзённа да 25 мая.

Наведваньне выстаўкі ад 4 да 10 гадзін увечары як экс[...] сіямі, гэтак і індывідуальна.

Для экскурсій будуць вызначаны консультанты.

У дзень адчыненьня выстаўкі 11-га мая а 7-й гадзіне ўвеч[...] У актавай залі Комвузу адбудзецца вечар змычкі студэнтаў Комву[...] працаўнікамі Рэдакцыі газэт, рабкорамі і ваенкорамі.

**ПАРАДАК ДНЯ:**

1. Адчыненьне выстаўкі.
2. Аб „дні друку", дакл. т. Будзінскага.
3. Мастацкая частка.

Уваход па разасланых білетах.

**Габінэт журналістыкі КУБ'у.**

# Коратка аб усім

○ З мэтай узмацненьня бягучай аздароўчай кампаніі сярод дзяцей і падлеткаў, Менаир аховы здароўя пастанавіў правесьці двухтыднёвік аховы здароўя з 15 мая па 1-е чэрвеня.

○ Гэтымі днямі пры Белжылсаюзе адчыняецца будвуч на 50 чалавек тэрмінам на 2-3 гады. Будвуч будзе мець два цэхі:—сьлясарна-ацяпленчы і сталярны.

○ Колегія Наркамасьветы вынесла пастанову аб адмене характарыстык у 7-годках.

○ Прадстаўніком Наркамасьветы організацыйны камітэт усесаюзнай олімпіяды тэатраў вылучыў тав. Мельніка. У журы вылучан тав. Некрашэвіч і адзін пісьменьнік.

○ Базай для прыёму ў выт[...] майстэрні колегіяй Наркома[...] устанавіла 4-годку. Тэрмін навуч[...] 2-3 гады. Усе майстэрні на [...] двух год будуць рэорганізава[...] профшколы паніжанага тыпу.

— Ва ўсесаюзнай тэатральнай [...]піядзе, якая адбудзецца ў [...] прымуць удзел БДТ-1, які [...] п'есы: „Міжбур'е", „Гута" і [...] Таксама прыме ўдзел БДЯТ, які [...] ка „Авечую крыніцу" і „Ботві[...]".

— Менакразет паслаў 15 ча[...] моладзі на курсы трактарыст[...] Крым. Апрача таго, 15 чалав[...] кіраваны ў Біра-Біджан—у с[...] і комуны.

# Паведамленьні

— Фрунзэўскі РК ЛКСМБ. 12-га мая а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні ФРК ЛКСМБ адбудзецца сход колектыву павадыроў піонэратрадаў.

— МенАК ЛКСМБ, Фрунзэўскі і Кастрычнікаўскі РК ЛКСМБ склікаюць на 14-5 а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Комсамолу нараду апоргаў і масавых працаўнікоў колектываў і цэх'ячэек па пытаньнях організацыі і правядзеньня політбою. Запрашаюцца таксама апоргі КСМ вайсковых частак. Своечасовая і абавязковая яўка апоргаў і масавых пра[...]коў ячэек—пад асабістую [...]насьць сэкратароў ячэек і [...]тываў.

— Бюро колектыву ЛКСМ[...] белпэдтэхнікуму даводзіць [...] дама комсамольцаў, якія пра[...]лі чыстку, аб тым, каб яны [...]нова прыслалі свае комсамо[...] білеты для належнай адзнак[...] бо самі прыехалі 15 мая.

# Саюзныя навіны

— Загадчыкам культпропаддзелу Менакругкому комсамолу зацьверджан былы сэкратар Койданаўскага РК ЛКСМБ тав. Палей.

— Пастановай МенАК ЛКСМБ 8-га чэрвеня склікаецца пленум акруговага бюро ДКА, на якім будуць заслуханы пытаньні аб удзеле піонэрорганізацый у соцбудаўніцтве і інш.

— МенАК ЛКСМБ сумесна з Менакрколгассаюзам з 15 мая організуе курсы рахункаводаў, разьлічаныя на 30 чалавек, з якіх 30 проц.—дзяўчаты. Працяг курсаў тры месяцы.

Адказны рэдактар— Рэдкол[...]

## ПАДПІСЧЫК-ЧЫТАЧ!

ІДУЧЫ Ў ВОДПУСК НЕ ЗАБУДЗЬ ВЫПІСАЦЬ ГАЗЭТУ ЦК ЛКСМБ

„ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА"

Без дадатковай аплаты газэта будзе пасылацц[...] па месцу твайго знаходжаньня

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599